Алесь Гарбуль

# Толькі любоў

## Вершы

Мінск
«Колорград»
2021

УДК 821.161.1(476)-93
ББК 84(4Беи)-93
Г20

*Для дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту*

*Фота на вокладцы належыць Уолтэру Чандохе.
Уолтэр Джордж Чандоха (1920–2019) – амерыканскі фатограф.
Амаль што 75 гадоў ён фатаграфаваў катоў,
зрабіў больш за 90 000 каціных здымкаў, якія былі надрукаваны
ў часопісах «Life» і «National Geographic».*

Навукова-даследчая Установа «Адраджэнне экалогіі Зямлі»

**ISBN 978-985-596-909-0**

© Гарбуль А., 2021
© Філімонаў П., ілюстрацыі, 2021
© Афармленне.
ТАА «Колорград», 2021



# Гой, які вясёлы скок!

Скок ды скок! Скок ды скок!
    Скача весела бычок!
Ён паклікаў нас гуляць —
    Мы прыбеглі паскакаць!
Скок ды скок! Скок ды скок!
    Захапляльны гэты скок!
Скок ды скок! Скок ды скок!
    Гой, які вясёлы скок!
Нашы скокі конік бачыць,
    Ледзь ад зайздрасьці ня плача!
Ён, нарэшце, не стрываў —
    Разам з намі заскакаў!

Скок ды скок! Скок ды скок!
    Захапляльны гэты скок!
Скок ды скок! Скок ды скок!
    Гой, які вясёлы скок!
Скок ды скок! Скок ды скок!
    З намі скачуць конь, бычок!
Скок ды скок! Скок ды скок!
    Прыцягальны гэты скок!
Скок ды скок! Скок ды скок!
    Захапляльны гэты скок!
Скок ды скок! Скок ды скок!
    Гой, які вясёлы скок!



# Кую, кую ножку

Кую, кую ножку —
Едзем у дарожку!
Кую, кую ножку —
Заўтра у дарожку!
Мы на самым ранку
Едзем да заранкі!
Зорачка-заранка
Дасьць нам абаранкаў!

Там нас сонейка усьцешыць,
Срэбны месячык рассмешыць,
Хмаркі з намі пасьпяваюць
І па небе пакатаюць!
Кую, кую ножку —
Едзем у дарожку!
Кую, кую ножку —
Заўтра у дарожку!